# ПРАЕКТ ПА ЗАХАВАННЮ ТРАДЫЦЫЙ ВІЦЕБСКАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЫ ЯК ЗДАБЫТКУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА І КУЛЬТУРЫ «ВІЦЕБСКАЯ АКВАРЭЛЬ»

А.Ю. Папроцкая (Віцебск)

Віцебская мастацкая школа - значная падзея ў гісторыі сусветнай культуры канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Імёны Марка Шагала, Юрыя Пэна, Осіпа Цадкіна і плеяды іншых выдатных мастакоў вядомы на ўсіх кантынентах, а «віцебская акварэль» з'яўляецца адной з найярчэйшых старонак віцебскай мастацкай школы. Віцебскі абласны краязнаўчы музей распрацаваў і ажыццяўляе праект па захаванню традыцый «віцебскай акварэлі» як здабытку нацыянальнага беларускага мастацтва і культуры. Праект падкрэслівае і абазначае унікальнасць развіцця акварэльнага мастацтва, мае мноства перадумоў для яго далейшага пашырэння і рэалізацыі пазначаных ідэй.

Перспектыўнымі мэтамі праекта з'яўляюцца: захаванне традыцый віцебскай мастацкай школы ў кантэксце беларускай культуры, даследаванне і папулярызацыя брэнда «віцебская акварэль» ў сучаснай культурнай прасторы, пашырэнне колькасці наведвальнікаў музея і далучэнне іх да вывучэння нацыянальнага беларускага мастацтва.

«Віцебская акварэль» - саюз індывідуальнасцяў, адданых акварэлі, звязаных падабенствам поглядаў на мастацтва, але не на яго «тэхналогію». Працэс станаўлення акварэльнай школы ў Беларусі вызначыўся ў другой палове 1960-х гадоў, але акварэль на Віцебшчыне мае больш глыбокія гістарычныя карані. Успомнім серыю пейзажаў Віцебска, якія выканалі мастакі Юзаф Пешка і Напалеон Орда. У 1910-1920-я гг. да акварэлі звяртаюцца вучні школы Юрыя Пэна - Марк Шагал, Давід Якерсон [2]. Новым вітком развіцця акварэльнай школы сталі 1950-я гг., калі Іван Сталяроў змог прывіць любоў да акварэлі многім сваім студэнтам. Адным з яго вучняў быў таленавіты Фелікс Гумен, які першым у Савецкім Саюзе напісаў і з бляскам абараніў дыпломны праект акварэллю.

З сярэдзіны 1960-х гадоў віцебскія акварэлісты Генадзь Шутаў, Віктар Лук'янаў, Вікенцій Ральцэвіч пераламілі стаўленне да акварэлі, якая раней лічылася несур'ёзнай тэхнікай. Яны прыцягнулі да акварэлі ўвагу публікі, павысілі яе статус у вачах даследчываў.

У 1995 годзе было створана грамадскае аб'яднанне «Віцебская акварэль». У аб'яднанне ўвайшлі 32 майстры розных узростаў і творчых лёсаў, ідэйным натхняльнікам аб'яднання стаў віцебскі мастак Міхаіл Ляўковіч. За 16 год існавання аб'яднання былі створаны шматлікія выставачныя праекты, не толькі абласныя, рэспубліканскія, але і міжнародныя. Так узнікла дзіўная з'ява – «віцебская школа акварэлі», якая зараз з'яўляецца яркай старонкай беларускай культуры. Усе мастакі ўнікальныя, заўседы ў пошуках новага, у тым ліку ў тонкасцях тэхналагічных прыёмаў, у працы з паперай.

Планамерная праца ў напрамку адраджэння «віцебскай акварэлі» вядзецца супрацоўнікамі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея з 2020 года. За гэты перыяд намаганнямі музейшчыкаў праведзены:

• Выстава «Віцебская акварэль. Чвэрць стагоддзя», была прысвечана 25-годдзю грамадскага аб'яднання «Віцебская акварэль» (г. Віцебск, 2020);

• Выязная выстава «Віцебская акварэль» сумесна з ДУ «Музей гісторыі горада Мінска», Мастацкая галерэя М. Савіцкага (г. Мінск, 2022);

• Выстава «Віцебская акварэль» у рамках Дзён Віцебскай вобласці ў г. Пскове (г. Пскоў, 2022);

• Выстава «Віцебская акварэль» у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі (г. Брэст, 2022);

• Выстава «Віцебская акварэль» у Музеі гісторыі і культуры Сыктыўдзінскага раёна ім. Э.А. Налімавай, Рэспубліка Комі (Расійская Федэрацыя, 2023);

• Выстава пленэрных работ удзельнікаў адкрытага фестывалю «Свята акварэлі ў Віцебску» – 2023 (г. Віцебск, 2023);

• Выстава «Віцебская акварэль» у рамках Дзён Віцебскай вобласці ў г. Пскове (г. Пскоў, 2024);

• Выстава «Віцебская акварэль» у культурна-выставачным цэнтры «Вернісаж» у г. Пракоп'еўск (Расійская Федэрацыя, 2024) і інш.

У рамках выставы «Віцебская акварэль. Чвэрць стагоддзя» (2020) у Мастацкім музеі (філіяле Віцебскага абласнога краязнаўчага музея) быў праведзены круглы стол «Віцебская акварэль» - як унікальная з'ява ў гісторыі развіцця сучаснага беларускага мастацтва», падчас якога былі прыняты шэраг стратэгічна важных рашэнняў па прасоўванні брэнда «віцебская акварэль» [3].

Для папулярызацыі тэхнікі акварэлі і захавання традыцый віцебскай мастацкай школы праведзены «Дзіцячы конкурс мастацкай творчасці, прысвечаный 100-годдзю з дня нараджэння Ісаака Юльевіча Бароўскага». Па выніках конкурсу ў філіяле Мастацкі музей адбылася выніковая выстава. Чатыры лаўрэаты ў трох намінацыях выканалі свае работы акварэллю.

У верасні 2023 года Віцебскім абласным краязнаўчым музеем быў праведзены адкрыты фестываль «Свята акварэлі ў Віцебску», які падарыў гледачам і мастакам магчымасць пазнаёміцца не толькі з працамі мэтраў «віцебскай акварэлі», але і наведаць мноства мерапрыемстваў, арт-кропак і майстар-класаў. Асновай фестывальнай праграмы стаў пленэр, які аб'яднаў на віцебскай зямлі больш за 20 мастакоў не толькі з розных куткоў нашай краіны, але і з Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі [4]. Пляцоўкай для яго правядзення стала адно з самых маляўнічых месцаў Віцебшчыны – Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва» (філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея). Па выніках фестывалю на пляцоўцы філіяла Мастацкі музей была адчынена выстава акварэлі [5].

Важным пунктам ў папулярызацыі брэнда «віцебскай акварэлі» з'яўляецца супрацоўніцтва з мастацка-графічным факультэтам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Гэта метадычная дапамога, партнерства ў галіне навуковых даследаванняў на тэме «віцебская акварэль», прадастаўленне мальбертаў для працы мастакам-удзельнікам плэнэраў і г.д. Мастакі, выкладчыкі ўніверсітэта сумесна з музеем ладзяць лекцыі для студэнтаў і школьнікаў, майстар-класы знакамітых акварэлістаў. Вывучаецца фенамен «віцебскай акварэлі», публікуюцца навуковыя працы.

Раз у два гады музеем плануецца правядзенне пленэру мастакоў-акварэлістаў у Музеі-сядзібе І.Я. Рэпіна «Здраўнёва». У рамках пленэру наведвальнікам будзе прапанаваны шэраг мерапрыемстваў культурна-адукацыйнай накіраванасці: майстар-класы па акварэлі, лекцыі і творчыя сустрэчы з мастакамі і мастацтвазнаўцамі. Па выніках пленэра акварэлі ў рамках адкрытага фестывалю «Свята акварэлі ў Віцебску»-2023 выдадзены каталог акварэлі, распаўсюджаны па бібліятэках краіны [1]. Віцебскі абласны краязнаўчы музей мае найбагацейшую калекцыю акварэляў выдатных беларускіх мастакоў. Музей плануе выданне каталога акварэлі і па выніках наступнага фестывалю акварэлі, у які будуць уключаны творы як сучасных акварэлістаў, так і мэтраў «віцебскай школы акварэлі». Каталог стане не толькі адным з вынікаў праекта, але і мог бы выкарыстоўвацца ў якасці нагляднага дапаможніка для навучання студэнтаў мастацкага, гістарычнага і музеязнаўчага напрамкаў.

Адной з перспектыўных мэт з'яўляецца адкрыцце доўгатэрміновай выставы акварэлі у Мастацкім музеі (філіяле Віцебскага абласнога краязнаўчага музея).

Адраджэнне і прасоўванне брэнда «віцебская акварэль» садзейнічае захаванню традыцый нацыянальнай беларускай культуры і мастацтва.

*Крыніцы і літаратура:*


1. Витебская акварель: каталог пленэра / сост. А. Ю. Папроцкая; под общ. ред. Т.А. Старинской. – Витебск: «Витебский городской центр маркетинга», 2024. – 24 с.
2. Лазука, Б.А. Гісторыя беларускага мастацтва. У 2 Т. Б. А. Лазука. – Мінск: Бларусь, 2007. – 351 с.
3. Мастацкі музей горада Віцебска [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vk.com/pen1854. Дата доступу: 01.10. 2024.
4. Папроцкая, А. Ю. Феерыя колеру на адкрытым фестывалі «Свята акварэлі ў Віцебску» - 2023 / А. Ю. Папроцкая // Мастацтва. – 2023. – № 10. – С. 45-47.
5. Папроцкая, А. Ю. Фестиваль акварели в Витебске как средство актуализации культурного наследия / А. Ю. Папроцкая // II Международная научно-практическая конференция, посвященная Году мира и созидания «Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт», Витебск, 26-27 октября 2023 г. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2023.


## ТРАНСФОРМАЦИЯ ХОРЕОГРАФИЧЕСКОГО ИСКУССТВА И ОБРАЗОВАНИЯ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ


К.В. Пилецкая (Витебск)


На протяжении XX-XXI веков художественная культура, искусство и образование в Беларуси развивались под воздействием различных исторических событий, включая войны и смену политических режимов. Трансформация, произошедшая в политической и экономической сферах отразилась на стилевом разнообразии искусства, а также повлияла на развитие образования, в том числе и хореографического. Исторические события XX века обусловили модификацию хореографического искусства и образования в Беларуси.

В конце XX века произошел распад Советского Союза, и с начала 1990-х годов в Беларуси возникла необходимость активизировать демократические процессы, формировать государственные институты, что отразилось на системе художественного образования. В то время как другие постсоветские страны стремились к быстрому реформированию, Беларусь осталась верна канонам советского образования в сфере хореографического искусства. В 1991 году Беларусь приобрела независимость, открывая новую страницу в своей истории, что стало важным этапом утверждения белорусской идентичности. Культурная политика современной Беларуси была направлена на сохранение национальных традиций, которая отразилась в хореографическом искусстве и образовании. В результате институциональных реформ 1990-х годов были созданы новые учебные заведения, хореографическое искусство и образование стало многоуровневым и разнообразным.

Цель данного исследования: проанализировать современное состояние хореографического искусства и образования.

Развитию хореографического искусства и образования в Республике Беларусь способствует введение современных образовательных программ, ориентированных на интеграцию традиционных народных белорусских танцев. Данная тенденция отмечается в работах белорусских исследователей. Так, заведующий кафедрой хореографии, профессор БГУКИ С.В. Гутковская, рассматривая хореографическое искусство начала XXI века, высказывает мнение о многовекторности его развития [1]. Данный аспект выявлен автором на основе изучения деятельности в детских и взрослых, любительских